ЗАЦВЯРДЖАЮ
загадчык кафедры

В.С.Громава

# Праграмныя патрабаванні да заліку па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”

1. Роля мовы ў жыцці грамадства.
2. Беларуская мова на лінгвістычнай карце свету.
3. Гістарычныя этапы развіцця беларускай літаратурнай мовы.
4. Нормы сучаснага беларускага вымаўлення.
5. Асаблівасці фанетычнай сістэмы беларускай мовы.
6. Прынцыпы і нормы сучаснага беларускага правапісу.
7. Віды інтэрферэнцыі : фанетычная, акцэнтная, лексічная, словаўтваральная, граматычная.
8. Асаблівасці лексікі беларускай мовы паводле паходжання.
9. Асаблівасці лексікі беларускай мовы паводле сістэмнай арганізацыі і значэння (сінонімы, антонімы, амонімы, паронімы).
10. Спецыяльная лексіка. Сутнасць паняццяў “спецыяльная лексіка”, “тэрмін”, “тэрміналогія”.
11. Стылі беларускай мовы.
12. Асаблівасці мовы дакументаў.
13. Асновы беларускага справаводства і дакументацыі.
14. Марфалагічныя асаблівасці беларускай мовы.
15. Назоўнік як часціна мовы.
16. Прыметнік як часціна мовы.
17. Лічэбнік як часціна мовы.
18. Займеннік як часціна мовы.
19. Дзеяслоў як часціна мовы.
20. Дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе.
21. Нязменныя часціны мовы.
22. Сінтаксічныя асаблівасці беларускай мовы.
23. Сучасны стан развіцця спецыяльнай лексікі беларускай мовы (асаблівасці і тэндэнцыі).
24. Марфалагічны спосаб утварэння спецыяльнай лексікі і тэрміналогіі.
25. Лексіка-генетычныя асаблівасці беларускай спецыяльнай лексікі.
26. Лексіка-граматычная асаблівасці беларускай спецыяльнай лексікі.
27. Лексіка-семантычныя асаблівасці беларускай спецыяльнай лексікі.
28. Арфаграфічныя нормы ў спецыяльнай лексіцы.
29. Функцыянаванне беларускай спецыяльнай лексікі.
30. Тэрмінаўтварэнне: крыніцы, спосабы, сродкі.
31. Першыя пісьмовыя помнікі афіцыйна-справавога і навуковага стыляў беларускай мовы.

32. Культура прафесійнага маўлення. Навуковае маўленне. Кампазіцыйна-змястоўная арганізацыя анатацыі, рэферата, тэзісаў, рэзюмэ.

Дацэнт кафедры В.Б.Несцяровіч

Рэкамендавана да зацвярджэння пратаколам пасяджэння кафедры ад 11.06.2024 № 12

ПАТРАБАВАННІ ДА ФАРМІРАВАННЯ КАМПЕТЭНЦЫЙ СТУДЭНТАЎ І ЎЗРОЎНЮ ЗАСВАЕННЯ ЗМЕСТУ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**“БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)”**

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” фарміруюцца наступныя кампетэнцыі:

**акадэмічныя:**

1) валодаць базавымі навукова-тэарэтычнымі ведамі і прымяняць іх для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;
2) умець працаваць самастойна;
3) быць здольным генераваць новыя ідэі (крэатыўнасць);
4) умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця;

**сацыяльна-асобасныя:**

1) валодаць якасцямі грамадзянскасці;
2) быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
3) валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый;

У выніку навучання вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен

***ведаць:***

- ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін;
- функцыі беларускай мовы як асноватворнага кампанента нацыянальнай культуры;
- месца беларускай мовы на лінгвістычнай карце свету;
- гісторыю фарміравання і развіцця беларускай мовы;
- асаблівасці беларуска-рускага білінгвізму і віды моўнай інтэрферэнцыі;
- стратыфікацыю лексікі беларускай мовы паводле сферы ўжывання;
- адметныя асаблівасці спецыяльнай лексікі;
- прыёмы тэрміналагізацыі;
- набор беларускай тэрміналагічнай лексікі адпаведнай спецыяльнасці;
- тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі па адпаведнай сферы навукова-прафесійнай дзейнасці;
- арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
- сістэму лексічных, граматычных і стылістычных сродкаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
- арфаграфічныя правілы, кадыфікаваныя ў новай рэдакцыі “Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (2008 г.);

***умець:***

- эфектыўна карыстацца моўнымі сродкамі беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці;
- адэкватна ўспрымаць спецыяльныя тэксты і навуковую галіновую інфармацыю;

- узнаўляць і інтэрпрэтаваць прафесійна арыентаваныя тэксты;

- складаць і весці на беларускай мове справавую дакументацыю;

***набыць навыкі:***

- моўных паводзін у разнастайных сітуацыях прафесійных і дзелавых зносін;

- якаснага і дакладнага перакладу навуковых і спецыяльных тэкстаў з рускай мову на беларускую і наадварот, з улікам стылістычнай прыналежнасці і асаблівасцей лексіка-граматычнай будовы тэкста;

- кампрэсіі і разгортвання навуковай інфармацыі, анатавання і рэферыравання;

- правільнага напісання розных службовых дакументаў;

- талерантных моўных паводзін ва ўмовах дзяржаўнага беларуска-рускага білінгвізму.

Форма атэстацыі студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне – залік.